# Ёсць ідэя!

Дзясяткі маладых наватараў і каля трыццаці інавацыйных праектаў – абласны этап рэспубліканскага конкурсу маладзёжных праектаў “100 ідэй для Беларусі” выдаўся надзвычай цікавым. Бо ўжо напрацягу многіх гадоў канцэнтруе вакол сябе лепшыя розумы краіны, з’яўляючыся выдатнай пляцоўкай для вылучэння ідэйнымі маладымі людзьмі цікавых, а часам і зусім неардынарных ініцыятыў. Пра свае наватарскія канцэпцыі, магчымасці іх практычнай рэалізацыі распавядаюць тыя, каму ў хуткім часе трэба будзе абараняць гонар вобласці на рэспубліканскім этапе конкурсу.




Аляксандр ГЛУТКІН, дацэнт кафедры дзіцячай хірургіі ГрДМУ:

- У гэтым годзе на маладзёжным конкурсе “100 ідэй для Беларусі прэзентаваў адразу два праекты. Адзін з іх - інавацыйная гідрагелевая матрыца для раневых павязак і касметычных сродкаў. Яна ўяуляе сабой стэрыльны, празрысты, эластычны і досыць трывалы біяматэрыял, які валодае астуджальнай здольнасцю. Дзякуючы гэтай асаблівасці выкарыстоўваць такую павязку можна, напрыклад, пры аказанні першай дапамогі пры апёках, а ў касметалагічных мэтах - у якасці патчаў. Калі мы кажам пра прымяненне у медыцынскіх мэтах, то такая матрыца з'яўляецца эфектыўнай перашкодай

Репозиторий ГрГМУ

для бактэрый, яна мяккая і эластычная, добра прылягае да раны і бязбольна выдаляецца з яе, таксама дае магчымасць лёгка апрацоўваць пашкоджанні лекавымі сродкамі. Распрацоўка з'яуляецца біялагічна чыстым прадуктам, таму не выклікае алергічных рэакцый. Ужываючы матрыцу у якасці касметалагічнага прадукту, гаворым пра такую перавагу, як шматразовасць. Эластычнасць патчаў забяспечвае максімальна шчыльны кантакт са скурай. Гэта ўзмацняе пранікненне актыўных кампанентаў як з самой матрыцы, так і папярэдне нанесеных на скуру. Ужо на дадзеным этапе гэтая распрацоўка лепш па характарыстыках, чым замежныя аналагі. Да таго ж танней. Пакупка павязкі памерам 10х12 сантыметраў абыдзецца прыкладна у два даляры.

Заенчкоўская Вольга

Репозиторий ГрГМУ